# АКТУАЛЬНЫЯ СТАРОНКІ МІНУЎШЧЫНЫ
# (публікацыі і пераклады)*

Часопіс працягвае знаёміць сваіх чытачоў з дакументамі палітычных партый. У гэтым нумары друкуецца першая праграма Партыі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Пад яе ўплывам знаходзілася значная частка беларусаў-католікаў, якія яшчэ ў 1915 г. аб'ядналіся і разгарнулі работу па стварэнню сваёй палітычнай партыі — Хрысціянскай злучнасці. На яе аснове ў 1917 г. і была ўтворана БХД. Па свайму саставу гэта была партыя беларускай інтэлігенцыі і духавенства, уваходзілі ў яе памешчыкі, буржуазія, кулацтва. Выступаючы за незалежнасць беларускай дзяржавы, яны прытрымліваліся палонафільскага напрамку. У 20—30-я гады дзейнічала на тэрыторыі Заходняй Беларусі. З мэтай большага ўплыву і на праваслаўных беларусаў у студзені 1936 г. была перайменавана ў Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (БНА). Існавала да 1939 г.

Друкаваны орган — газета «Крыніца», а з 1926 г. — «Беларуская крыніца».

## ПРАГРАМА УСТАВЫ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ЗЛУЧНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ[1]

Дэмакратыя па-грэцку значыць тое, што па-беларуску народаўласць: уласць народу над сабою самім. Праз народ разумеюцца тут шырокія масы чалавечага роду, а праз уласць: кіраванне сваёю доляй на сваё супольнае шчасце. У аснове дэмакратыі ляжаць дзве думкі, як бы пружыны: высокая вага каждай людской асобы і роўнае права ўсіх чыста людзей да шчаслівага існавання.

Ня трэба вялікай дальназоркасці, каб заўважыць у гісторыі факт, што чалавецтва пасоўваецца наперад у кірунку дэмакратычным, то значыць, што шырокія масы народныя што раз больш і больш здабываюць сабе права ва ўсіх галінах жыцця.

Папулярызацыя навукі, здабычы працоўнага люду, дробных народаў — сведчаць аб гэтым німала. Але рух дэмакратычны ні адным плыве руслам. Шмат ён мае кірункаў і шмат адзевае формаў. Найважнейшых кірункаў ёсць два: дэмакратыя сацыяльная і дэмакратыя хрысціянская. Кожная з гэтых дэмакратый мае свой светагляд, свае прынцыпы, сваю праграму. Абедзве маюць аднакавыя мэты: дабро мас народных, але не абедзве туды ідуць адной дарогай, абедзве прызнаюць факт, што чалавецтва хворае і што яго трэба лячыць, але не абедзве тыя ж самыя прыпісваюць лекі. Дэмакратыя хрысціянская прынцыпы свае бярэ з хрысціянскага светагляду і на аснове гэтых прынцыпаў будуе сваю праграму. Лініі гэтай праграмы абрысаваны былі ясна і выразна папежам Лявонам XIII у г. 1891 і 1901 у лістах «Rerum novarum» і «Craves de kommuni». Сягоння ва ўсіх бальшых гаспадарствах Еўропы існуюць сувязі** хрысціянскай дэмакратыі і маюць агромны ўплыў на кірунак жыцця грамадзянскага. У Польшчы існавала тоже сувязь Х. Д. у Варшаве яшчэ перад вайной. У Расеі зараз па першай рэвалюцыі заснавалася Х. Д., шкада, што толькі сярод саміх каталікоў, і з'езд дэлегатаў у Петраградзе 14—16 лютага 1918 г. сведчыў аб вялікам распаўсюджанні гурткоў Х. Д. Дужа добра і моцна стаяла сувязь Х. Д. «Лучнасць» у Петраградзе, у Мінску завязаўся беларускі гурток Х. Д. 4 верасня 1918 г. Праграма яго напісана на аснове тэорыі і практыкі Хрысціянскай дэмакратыі на ўсім свеце.

Вось яе нарыс:

### I. Агульныя прынцыпы

1) Хрысціянская дэмакратыя ёсць грамадзянская сувязь, што хоча завесці лад на свеце на аснове хрысціянскай і дэмакратычнай справядлівасці, роўнасці, міласці і свабоды. З натуры сваёй Х. Д. ёсць эвалюцыйная, надпалітычная, міжнародная, надстановая.

* Раздзел вядзе прафесар У. К. Коршук.

** Відаць, маюцца на ўвазе партыйныя аб'яднанні. — Рэд.

2) Х. Д. змагаецца перад усім з капіталізмам, у каторым бачыць адну з найважнейшых прычын беднасці і нэндзы працоўных мас і хоча завесці такі лад, каб кожнаму чалавеку магчыма было сваёю працай здабыць сабе хлеб патрэбны і карыстаць з усяго культурнага багацця. Х. Д. проціў усякіх прывілеяў класавых.

3) Х. Д. прызнае права існавання, развіцця і кіравання сабой хоць найменшага народу кожнага і ўважае разумны і справядлівы патрыятызм за важную пружыну ў жыцці людскім. З'езд Х. Д., адбыты 14—16 лютага 1918 г. у Петраградзе, заявіў, што ў адносінах да малых народаў як Літва, Латвія, Беларусь, Украіна трэба стаяць на грунце поўнага іх самаазначэння.

## II. Х. Д. і рэлігія

Хрысціянская дэмакратыя прызнае рэлігію за найважнейшую падставу існавання людскага, без каторай няпоўным і неспакойным было б жыццё як аднаго чалавека, так і ўсіх народаў. Х. Д. маець тое глыбокае перакананне, што вядомая арганізацыя праўдзівай рэлігіі — касцёл каталіцкі — мае сілу ня толькі збаўляць душы людскія, але і запэўніць поступ праўдзівы* і шчасця на зямлі цэламу чалавецтву.

Дзеля таго Х. Д., будучы проціў усякіх агранічэнняў рэлігійных у гаспадарстве, але хочучы запэўніць свабоду касцёлу каталіцкаму, жадае:

1) Каб касцёл прызнаваўся за інстытуцыю суверэнную, каторая кіруецца сваімі ўставамі.

2) Каб касцёл не агранічываўся ў правах і не прыціскаўся ўрадам.

3) Каб касцёл быў у праве мець багацце як рухомае, так і нерухомае.

4) Каб гаспадарства адшкадавала касцёлу ўсе крыўды, каторыя зрабіла, касуючы маёмасць касцёльную.

5) Каб касцёл мог адкрываць ахронкі, школы, рознымі спосабамі вясці асвету і кіраваць усім гэтым.

6) Каб мог адкрываць і шырыць каталіцкія кляштары.

7) Каб былі капеланы для школ, войска, бальніц і дамоў працы.

8) Каб культ рэлігіі можна было спраўляць свабодна.

9) Каб аб падставах жыцця каталіцкага можна было свабодна гаварыць і праводзіць іх у жыццё, як каждага чалавека, так і цэлага грамадзянства.

10) На Беларусі Х. Д. «Злучнасць» ставіць сабе спецыяльную мэту: зблізіць усіх каталікоў і праваслаўных і аб'яднаць іх у аднэй веры з рознымі абрадамі.

## III. Сям'я і школа

Прызнаючы хрысціянскую сям'ю за падставу ўсёй цывілізацыі і лёсаў людскіх, і бачучы ў тэй інстытуцыі натуральную, а не вынікшую з права людского (і дзеля таго незаступімую), Х. Д. дамагаецца каб рэлігія, законы, эканомія, жыццё сацыяльнае ішлі да ўмацавання, а не аслаблення сям'і хрысціянскай.

Дзеля гэтага Х. Д. жадае:

1) Каб права цывільнае не нарушыла сталасці і неразлучнасці малжонства.

2) Каб не было малжонстваў мешаных.

3) Каб права не гвалціла перакананняў рэлігійных і абычаяў сям'і каталіцкай.

Апрыч гэтага, Х. Д. хоча:

4) Абараняць дзяўчат ад распутнікаў праз устанаўленне кар на іх.

5) Змагацца з публічнай распустай, закладаючы дамы працы і паправы.

6) Караць тых лекараў і лекарак, каторыя робяць практыкі, згубныя для матак і дзяцей.

7) Стварыць правадаўства фабрычнае, каторае забяспечвала б утрыманне сям'і.

8) Закладаць кватэры для работнікаў, кіруючыся вымаганнямі маральнасці і гігіены.

9) Устраіваць для работнікаў у местах сады, злучоныя з цэнтрамі фабрычнымі трамваямі.

10) Устанавіць строгія правы для шынкоў і месцаў, прызначаных на публічныя гульні.

11) Увясці праўную плату сямейным, каторай хваціла б на ўтрыманне ня толькі работніка, але і яго сям'і. Ва ўсім тым, што датычыць навукі і адукацыі ў школах, Х. Д. трымаецца таго пагляду, што школа ёсць дальнейшы працяг сям'і і дзеля чаго бацькі разам з вучыцелямі думаюць, як весці адукацыю. Урад жа, забочычыся аб пашырэнні асветы паміж грамадзян, ёсць толькі памочнікам бацькоў, або заступае іх там, дзе бацькі сваіх абавязкаў выпаўніць ня могуць, або ня хочуць.

З гэтай прычыны Х. Д. дабіваецца каб:

1) Увясці паўшэчнае пачатковае навучанне ў роднай мове, не ўстанаўліваючы абавязку ўчыцца ў школах урадавых.

2) Зраўняць школы прыватныя, хрысціянскія са школамі ўрадовымі ў правах і дапамогах грашовых.

---

* Так ў тэксце арыгінала. Мабыць, трэба зразумець — праўды. — Рэд.

3) Увясці навуку рэлігіі каталіцкай ва ўсе школы ўрадавыя і прыватныя на роднай мове моладзі.

4) Дамагацца, каб школьная адукацыя дзяцей вялася паводлуг маральнасці хрысціянскай.

## IV. Уласнасць

Х. Д. прызнае, што прыватная ўласнасць ёсць падставай цывілізацыйнага поступу грамадзянства. Не працівіўчыся, каб уласнасць памалу пераходзіла ў формы калектыўныя, як напр., манаполіі розныя і кааперацыі, Х. Д. жадае, каб уласнасць прыватная як такавая усё-такі не касавалася. Разам з гэтым Х. Д. пераканана, што ўласнасць прыватная, даючы ня толькі правы, але і накладаючы абавязкі грамадзянскія, памагае да выраблення ў людзях ініцыятывы і самадзельнасці.

Х. Д. рупіцца, каб як найшырэйшыя слаі працоўнікоў мелі свае ўласныя варштаты працы і дамагаецца:

1) Каб закладаліся цэнтральныя работніцкія банкі, работніцкія кааператывы, злучнасці працы і другія арганізацыі.

2) Каб бедныя людзі маглі здабываць сабе кватэры, варштаты і г. д. за пазычаныя ў гэтых банках грошы.

3) Там, дзе работнікі наймаюцца, каб гаспадар дзяліўся з імі даходамі.

4) Каб можна было свой маёнтак апісаць каму, або дараваць.

У справе зямельнай Х. Д. жадае:

1) Каб была падзеляна казённая зямля паміж беззямельнымі і малазямельнымі з мэтай стварэння малой уласнасці. Гэты падзел маюць зрабіць мясцовыя самаўпраўленні, маючы на ўвазе ўсіх заінтэрасаваных, а такжа меншасці народныя і рэлігійныя.

2) Агранічыць вялікую ўласнасць прыватную, аблажыўшы яе вялікімі падаткамі.

3) Паднясці і падвышыць культуру зямельную дапамогамі ўраду, праводзячы чугункі, дарогі бітыя і т. д.

4) Паднясці культуру хлебаробаў адкрыццям для ніх школаў, разводзячы гаспадарствы прыкладныя, робячы выставы.

У адносінах да капіталу Х. Д. ставіць сабе мэтай:

1) Змагацца з капіталізмам ва ўсіх яго формах і не адкідаючы капітал, самому лучыць яго з працай у адніх руках.

2) Зрэфармаваць правы аб таварыствах акцыйных, сіндыкатах і трэстах.

3) Змагацца з усякай спекуляцыяй на біржы і ў гандлю.

У адносінах да падаткаў Х. Д. радзіць:

1) Завясці падаткі ад даходаў і капіталаў непрадукцыйных.

2) Скасаваць цяжкія падаткі на жыўнасць і малыя спадкі ў простай лініі.

Навогул навука Х. Д. ёсць, каб усе рэформы, што да ўласнасці прыватнай, вяліся эвалюцыйна, згодна з падаткамі, справядлівасці грамадзянскай, а таксама эканоміі народнай.

## V. Праца

Х. Д. прызнае працу за найважнейшую падставу жыцця людскага і поступу яго як матэрыяльнага, так і духоўнага. Прыдаючы такое высокае значэнне працы, Х. Д. трымаецца таго погляду, што праца мусіць зрабіць шчаслівым жыццё працаўніка і яго сям'і і не павінна быць такою, каторая б псавала здароўе яго. Баронячы працоўны люд, Х. Д. жадае справядлівага права, каторае б:

1) Устанавіла міністэрства працы.

2) Азначыла мінімум платы сямейнай, пачынаючы ад работ публічных.

3) Адзінакавую плату за такую самую працу для мужчын і кабет.

4) У нядзелю і святкі адпачынак для ўсіх.

5) Максімум гадзін працы.

6) Каб не працавалі ў начы апрача там, дзе гэтага ня можна скасаваць.

7) Каб маткі не працавалі на фабрыках і каб праца дзяўчат была агранічана.

8) Каб дзеці да 14 гадоў саўсім не працавалі і агранічыць працу малалетніх ад 14 да 18 г.

9) Забараніла працаваць моладзі і кабетам там, дзе гэта шкодзіла б іх здароўю.

10) Плаціць і ў часе хваробы, а таксама цяжарным 4 тыдні перад і 6 пасля полягу.

11) Каб работнік меў запамову тады, калі ня мае працы, або ня можа працаваць па хваробе і старасці.

12) Каб быў інспектар фабрычны.

13) Каб у школах учылі розных рамёслаў.

14) Каб работнікі маглі арганізавацца свабодна. Наогул Х. Д. жадае ад права абароны і арганізацыі працы, каб людзі шанавалі працу і разумна працавалі.

## VI. Народ і гаспадарства

Х. Д. бачыць у падзеле людзей на народы апеку божыю над людзьмі і прызнае, што мова ёсць недатыкальны скарб кожнага грамадзяніна, без каторага няма культуры духоўнай і матэрыяльнай людзей. Паводлуг Х. Д., кожны народ мае права свабодна развіваць формы жыцця свайго народнага і патрыятычнага. Х. Д. мае перакананне, што не народ для гаспадарства, але гаспадарства патрэбна для пажытку і бяспечнага жыцця народу. Дзеля таго жадае, каб справы народныя вышэй ставіліся як палітычныя, з другой стараны, аднак Х. Д. агульнае дабро людзей ставіць вышэй, як інтарэсы якога-небудзь народу і хоча, каб палітыка кіравалася справядлівасцю грамадзянскай і міжнароднай. У граніцах кожнага гаспадарства Х. Д. жадае:

1) Каб усе народы мелі роўныя правы і каб лучыліся з якім-небудзь гаспадарствам толькі на засадзе дабравольнай лучнасці.

2) Каб было роўнае права ў адносінах да мовы ўсіх народаў ва ўсіх урадах гаспадарства.

3) Каб права для ўсіх было роўнае, ня гледзячы на народ, рэлігію і г. д.

4) Каб было мець паўшэчнае справядлівае галасаванне.

5) Каб была устаноўлена бесплатная публічная парада адвакацыйная.

6) Каб была недатыкальнасць асобы грамадзяніна, яго кватэры, уласнасці і карэспандэнцыі.

7) Каб праведзена вольнасць слова, друку і сувязей але з тым, каб кожны адказваў перад судом за шкадлівую для грамадзянства, ці каго-небудзь работу, агітацыю, а також прэсу.

8) Каб усе, каторыя знаходзяцца на службе публічнай, адказвалі перад судом.

9) Увядзенне самаўраду гміннага і правінцыяльнага.

10) Што датычыць айчыны сваей — Беларусі — Х. Дэмакратычная Злучнасць Беларусі жадае, каб яна была цэлай, непадзельнай і вольнай.

11) Каб на Беларусі была роўнасць і свабода грамадзянская і запэўнены правы народных меншасцяў.

12) Каб сойм вольнай Беларусі, каторы будзе выдаваць правы, быў выбраны на аснове справядлівага, паўшэчнага галасавання і каб толькі ён меў права сказаць слова аб урадзе і яго воле на Беларусі і аб адносінах да другіх гаспадарств[2].

[1] Ustava i prahrama Chryscyanskay Demakratycznay Zlucznasci Bielarusau. Miensk, 1920. S. 8—15.

[2] Па тэхнічных умовах лацінка арыгінала заменена кірыліцай, ліквідаваны разнабой у напісанні абрэвіятуры Х. Д. Тэкст у рэдкалегію даставіла А. М. Васільева.

5 Зак. 1047